4 (201)
красавік

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

**Рэдакцыйная калегія:**

Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

**Рэдакцыйная рада:**

Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Надзея Кушнер, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Рыгор Лазько — Самавызначэнне, прыпыненае гвалтам *(Да пытання аб разгоне Усебеларускага з'езда 1917 года)* 5

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Андрэй Буча — Беларускі навуковы кабінет у Празе (1927—1930 гг.): стварэнне і дзейнасць 11

Дзяніс Філіпчык — Абрад "Варваркі": змест, асаблівасці, перспектывы захавання 19

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Алег Дзярновіч — Насарог для султана. Падарожжа Мацея Стрыйкоўскага ў Асманскую Імперыю ў 1574—1575 гг. 25



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ — гэта скульптар грамадства

*Увазе чытачоў прадстаўляем адказы на пытанні бліц-інтэрв'ю пераможцы гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства "Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі 2016" у намінацыі "Педагагічны дэбют" Івана Пугача, студэнта 4 курса гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.*

**— Якія, на ваш погляд, факты з гісторыі Беларусі павінен ведаць кожны грамадзянін нашай краіны?**

— На мой погляд, складана вылучыць пэўныя факты і адарваць іх ад агульнагістарычнага кантэксту. На жаль, у грамадстве існуе меркаванне, што, ведаючы нейкі гістарычны факт альбо сукупнасць нейкіх гістарычных фактаў, чалавек ведае гісторыю. Такім чынам, паміж гісторыяй і наборам фактаў неапраўдана ставіцца знак роўнасці. Чаму неапраўдана? Бо факт ёсць з'ява, фрагмент мінулага або рэчаіснасці, якая складае аб'ект чалавечай дзейнасці альбо пазнання. Будучы адзінкавай з'явай, факт непасрэдна звязаны разнастайнымі адносінамі з іншымі кампанентамі рэчаіснасці. Таму больш важным прадстаўляецца захаванне і асэнсаванне грамадзянамі нашай краіны той спадчыны, тых традыцый, якія фарміраваліся ад старажытных часоў і да сённяшняга дня.

**— Як вы лічыце, якімі гістарычнымі асобамі можа ганарыцца наш народ і чаму?**

— Беларусь багатая на асоб, якімі можа ганарыцца наш народ. Аднак, не прыніжаючы заслуг іншых, я назаву такіх асоб, як Еўфрасіння Полацкая, Янка Купала, Якуб Колас і Максім Багдановіч. Па-першае, жыццё і дзейнасць гэтых людзей у вялікай ступені паўплывала на мой светапогляд і мае адносіны да гісторыі і сучаснасці маёй Радзімы. Па-другое, тая спадчына, якую пакінулі гэтыя выбітныя дзеячы, на маю думку, мае дачыненне да кожнага, без выключэння, беларуса.

**— Якія падзеі, на вашу думку, з гісторыі Беларусі сталі лёсавызначальнымі для яе?**

— Лічу, што найбольш лёсавызначальным для гісторыі Беларусі і беларускага народа было XX ста-



**ПУГАЧ Іван Валянцінавіч.**

*Нарадзіўся ў 1995 г. у Мінску. У 2012 г. паступіў на гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі XIII—XVI стст., методыка выкладання гісторыі. Аўтар некалькіх публікацый у зборніках навуковых прац студэнтаў і выкладчыкаў гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

годдзе. Менавіта ў першай чвэрці XX стагоддзя была ўтворана ўласная беларуская дзяржава. Далей лічу неабходным вылучыць восень 1939 года, і асабліва першую палову лістапада, калі былі прынятыя законы аб аб'яднанні Заходняй Беларусі і БССР. Я спадзяюся, што ў памяці беларускага народа застанецца і сумесная з народамі свету Перамога над нацысцкімі агрэсарамі ў Другой сусветнай вайне. Лёсавызначальным этапам не толькі для беларусаў, але і для народаў былога СССР была Вялікая Айчынная вайна. Ну і, зразумела, нельга абмінуць увагай такую падзею, як утварэнне незалежнай і суверэннай Рэспублікі Беларусь.

**— Хто паўплываў на ваша рашэнне паступіць у педагагічны ўніверсітэт і выбраць прафесію настаўніка гісторыі?**

— Безумоўна, першыя, хто паўплываў на гэты выбар, — мае бацькі, якія таксама педагогі. З маленства я намагаўся быць падобным да іх, мяне цікавіла іх прафесія. Пасля я паступіў у 14-ю гімназію горада Мінска. Прыклад маіх школьных настаўнікаў, а таксама мастацкага кіраўніка і педагогаў ансамбля "Дударыкі", у якім я ўдзельнічаў з самага дзяцінства і да заканчэння гімназіі, яшчэ больш прывабіў мяне менавіта да гэтай сцежкі, а любоў да гісторыі прадвызначыла тое, што я буду навучацца менавіта на гістарычным факультэце педагагічнага ўніверсітэта. Дзякуючы маім бацькам, родным і блізкім, настаўнікам і ўніверсітэцкім выкладчыкам мне не давялося шкадаваць аніводнага дня аб выбраным мной накірунку.

**— Завяршыце выраз: "Настаўнік гісторыі – гэта..."**

— Настаўнік гісторыі — гэта скульптар грамадства, чалавек, які можа дапамагчы сваім вучням асэнсаваць каштоўнасць гістарычнай спадчыны для разумення сучаснасці і прагназавання будучыні.

**— Што дапамагала або спрыяла вашаму актыўнаму ўдзелу ў конкурсе прафесійнага майстэрства "Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі 2016" у намінацыі "Педагагічны дэбют"?**

— Перш за ўсё на працягу ўсяго конкурсу побач са мной былі мае родныя, блізкія і сябры. Яны дапамагалі мне ва ўсім. Да таго ж моцная падтрымка адчувалася з боку выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта і факультэта, а таксама з боку дэканата гістарычнага факультэта.

**— Якім вы бачыце сваё будучае ў прафесіі?**

— Я спадзяюся, што атрыманыя на працягу майго шляху да педагагічнай прафесіі вопыт і веды дапамогуць мне пераадолець усе магчымыя цяжкасці, і я здолею стаць сапраўдным педагогам.

**Дзякуй за адказы на пытанні!**

*Матэрыял падрыхтавала* ***Наталля Матусевіч.***

*Гарадскі конкурс прафесійнага майстэрства "Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі" праводзіцца штогод з 1991 года. Заснавальнікам конкурсу з'яўляецца камітэт па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта пры падтрымцы Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, арганізатарам выступае Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі.*

*Конкурс у намінацыі "Педагагічны дэбют" праводзіцца з мэтай фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых педагогаў, выяўлення, раскрыцця і падтрымкі творчага патэнцыялу студэнтаў выпускных курсаў вышэйшых навучальных устаноў педагагічных спецыяльнасцяў, павышэння прэстыжу прафесіі настаўніка і стварэння пазітыўнага іміджу ўстаноў вышэйшай адукацыі, у якіх маюцца педагагічныя спецыяльнасці.*

*З 16 лютага па 31 сакавіка 2016 г. канкурсанты з пяці сталічных ВНУ — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта – удзельнічалі ў намінацыі конкурсу "Педагагічны дэбют". Конкурс адбываўся ў тры туры. У першым і другім турах адным з заданняў былі арганізацыя тэматычных вучэбных занняткаў у гімназіях і школах Мінска. У трэцім туры канкурсантам былі прапанаваныя заданні "Рэклама метадычнага прыёма "Мая педагагічная знаходка" і "Конкурс-сюрпрыз".*

*Па выніках конкурсу дыпломы I ступені камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама ўручаны наступным фіналістам конкурсу:*

***Раманоўскай Вікторыі Алегаўне,*** *студэнтцы IV курса спартыўна-педагагічнага факультэта спартыўных гульняў і адзінаборстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры;* ***Кашуба Надзеі Аляксандраўне,*** *студэнтцы V курса факультэта прыродазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;* ***Колбіку Віталю Уладзіміравічу,*** *студэнту IV курса спартыўна-педагагічнага факультэта масавых відаў спорту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры;*

*Ганаровыя граматы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама ўручаны:*

*лаўрэату конкурсу (3-е месца)* ***Быкоўскай Марыі Леанідаўне,*** *студэнтцы IV курса факультэта пачатковага навучання БДПУ імя Максіма Танка;*

*лаўрэату конкурсу (2-е месца)* ***Малевіч Наталлі Вячаславаўне,*** *студэнтцы V курса факультэта французскай мовы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта;*

*пераможцу конкурсу* ***Пугачу Івану Валянцінавічу,*** *студэнту IV курса гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ